Если принять данное выше определение метафизики, как учение о мире, в целом, то нельзя не признать, что метафизика есть наука, необходимая для всякой философской школы, для всякого философского направления, кроме крайнего скептицизма [3].

Религиозно-философское мировоззрение Н.О. Лосского очень сложно и неоднозначно. С одной стороны, он строит логическую метафизическую систему, а с другой – его книга о Достоевском и некоторые другие работы дают представление о личном религиозном мировоззрении философа, которое невыразимо через абстрактную метафизическую схему.

Лосский обосновывал создание Богом мира. Бог, по его мнению, представляет сверхличное, сверхмировое существо. Понимание этого непременно приводит к пониманию Троицы: «Учение о Триедином Боге некоторые люди считают противоречивым и потому отвергают его: они находят в нем невыносимую для нашего ума нелепость, именно утверждение, что три есть вместе с тем не три, а единица. В действительности противоречия в христианском догмате Троичности нет. Бог в своей невыразимой человеческими понятиями глубине есть существо сверхличное: поэтому нет ни какого противоречия в мысли, что откровение Его осуществляется и для мира, и в Нем Самом, как жизнь Трех Лиц» [4, с. 320].

**Заключение.** Философию Лосского можно представить в качестве трех достаточно автономных сфер – интуитивизма, персоналистической метафизики и религиозной философии. Чтобы понять философское мировоззрение Николая Лосского, на наш взгляд, недостаточно исходить только из принципов рациональной логики. В основе философских построений Лосского лежит его собственная «внутренняя логика». Ему удалось создать законченную систему, но не в теории, а в своем внутреннем мире.

Литература:

1. Васильев, В.А. Н.О. Лосский о добре и зле, добродетелях и пороках / В.А. Васильев // Социально-гуманитарные знания. – 2005. – № 6. – С. 153–169.
2. Маслобоева, О.Д. Интуитивизм, органицизм и синергетика в учении Н.О. Лосского / О.Д. Маслобоева // Вестник Ленинградского государственного университета им. А.С. Пушкина – 2011. – № 2. Т. 2. – С. 112–121.
3. Лосский Н.О. Типы мировоззрений / Электронная библиотека Одинцовского благочиния [Электронный ресурс]. – 2016. Режим доступа: http://www.odinblago.ru/tipi_mirovozzr/?search_word. – Дата доступа: 4.10.2016.
4. Лосский, Н.О. Бог и мировое зло / сост. А.П. Полякова и др. – М.: Республика, 1994. – 432 с.

## ФАРМІРАВАННЕ І РАЗВІЦЦЁ НАСЕЛЕНЫХ ПУНКТАЎ СЕННЕНСКАГА РАЁНА

***Бараноўскі А.В.,***
*магістрант ВДУ імя П.М. Машэрава, г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*
Навуковы кіраўнік – Юрчак Д.В., канд. гіст. навук, дацэнт

Асноўнай і найбольш распаўсюджанай формай рассялення на тэрыторыі Сенненшчыны сталі населеныя пункты. Іх з'яўленне можна разглядаць, як адзін з найважнейшых індыкатараў засвоенасці новых зямель і лічыць адным з самых значных фактараў каланізацыі рэгіёну.

Актуальнасць дадзенай тэмы выклікана тым, што фарміраванне і развіццё населеных пунктаў на прыкладзе малых рэгіёнаў, уяўляе цікавасць для даследчыкаў самых розных гістарычных перыядаў, ад старажытнасці і да сучаснасці. Мэтай нашага даследавання з'яўляецца вывучэнне гісторыі фарміравання і развіцця населеных пунктаў Сенненскага раёна.

**Матэрыял і метады.** Асобны раздзел кнігі “Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Сенненскага раёна прысвечаны гісторыіі населеных пунктаў раёна [1]. Шаруха, І.М. у сваім артыкуле разгледзеў гістарычныя тыпы сельскага рассялення Беларусі [2]. У працэсе даследавання выкарыстоўваліся агульнанавуковыя метады (абагульненне, аналіз, сінтэз) і спецыяльна гістарычныя (гісторыка-генетычны, гісторыка-сістэмны і гісторыка-тыпалагічны) метады.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Засяленне тэрыторыі Сенненскага раёна адбылося ў 11 тысячагоддзі да н.э., яно ішло, у асноўным, па далінах рэк басейна Верхняга Дняпра, аб чым сведчыць адкрыццё археалагамі шэрага стаянак гэтага часу.

*Стаянка* гэта неўмацаванае часовае пасяленне першабытнага чалавека, пазней – аселых плямёнаў каменнага і бронзавага вякоў. [3, с. 320–321]. Стаянкі на тэрыторыі раёна не выяўлены, аднак няма сумнення, што яны былі. У VII ст. да н.э. на тэрыторыі Віцебшчыны пачаўся жалезны век. Рост прадукцыйных сіл садзейнічаў з’яўленню і паглыбленню супярэчнасцей паміж родамі і плямёнамі, што вылікала ўзмацненне ваеннай небяспекі і з’яўленню ўмацаванных паселішчаў – *гарадзішчаў*. [4, с. 120]. На Сенненшчыне выяўлена чатыры гарадзішча: каля горада Сянно, вёсак Старая Беліца, Новае сяло, Машчоны.

У IV–V стст. з развіццём плужнага земляробства працягваецца працэс распадзення патрыярхальна-радавых адносінаў. Новыя сацыяльна-эканамічныя ўмовы спрыяюць змяненню характара паселішчаў. Так замест гарадзішчаў развіваюцца адкрытыя, неўмацаваныя *селішчы*. Разам з тым гарадзішчы захоўваюць ролю крэпасці-прыстанішча на выпадак ваенных дзеянняў [1, с. 27–34]. У IX–XI ст. узнікае новы тып паселішча – *пагост*, які фарміруецца на тэрытарыяльных, а не на роднасных сувязях [5, с. 224].

У летапісных дакументах XI–XII стст. часта згадваюцца княжацкія, баярскія, і царкоўныя *сёлы*. У сілуэце сяла дамінавала царква. Паступова з вотчынага цэнтра сяло пераўтвараецца ў адміністрацыйна-



Репозиторий ВГУ

тэрытарыяльны цэнтр [2, с. 115]. Сёлы Міхнава і Зубава ўпамінаюцца ў 1634 годзе ў даравальнай грамаце на маёнтак Кеміно [1, с. 599]. *Вёска*, як тып пасялення вядома з XI ст. і часта згадваецца ў дакументах XIII–XV стст. На беларускіх землях так пазначалі паселішчы без царквы. У XVII ст., паводле інвентароў, тэрмін "веска" і "сяло" ужываліся ў аднолькавай меры [5, с. 225]. У 1594 годзе ўпамінаюцца вёскі Зямковічы, Нярэйша, Забараўе, Прыхабы ў запісах аб землях, раздадзеных каралём польскім і вялікім князем літоўскім Жыгімонтам III Вазай [1, с. 603].

У пачатку XIV ст. уся Полацкая зямля, а разам з ёй і Сенненшчына ўвайшла ў склад Вялікага княства Літоўскага. У XV-XVI стст. з'яўляецца яшчэ адзін гістарычны тып пасялення – *мястэчкі*. Яны ўзніклі ў сувязі са з'яўленнем феадальных вотчаных таргоў і распаўсюджваннем грашовай рэнты. Існавала два віда мястэчак – казённыя і прыватнаўласніцкія [5, с. 230]. У 1665 годзе ў інвентары маёнткаў Палонна і Нямойта ўпамінаюцца мястэчкі: Буй і Пустынкі [1, с. 590, 603].

Вялікі князь Жыгімонт II Аўгуст ажыццявіў у дзяржаўных маёнтках рэформу, якая атрымала назву "Валочная памера". У адпаведнасці з ёй у большасці рэгіенаў ВКЛ быў уведзены трохпольны севазварот. Пасля межавання паміж вымеранымі валокамі заставаліся адрэзкі – *засценкі*. Яны звычайна знаходзіліся на краі поля. Звычайна засценкавыя землі аддавалі дробнай шляхце, якая, жыла адным ці некалькімі дварамі. Другім тыпам пасялення шляхты на Беларусі былі *ваколіцы*. Яны мелі больш вузкае распаўсюджванне і ўяўляў сабой параўнальна невялікі населены пункт вельмі разнастайнай планіроўкі, нешта падобнае на комплекс з 10-20 фальваркаў [2, с. 118].

У канцы XV – пачатку XVI стст. пачалі ствараццa *фальваркі*. Спачатку гэта былі невялікія шляхецкія маёнткі, зарыянтаваныя на вытворчасць збожжа на продаж, пазней назва паселішча замацавалася наогул за ўсімі дробнымі маёнткамі. На Сенненшчыне было распаўсюджана шмат фальваркаў. Напрыклад, фальваркі: Александрова, Ладзікава, Розмыслова і інш. Фальваркі мелі некаторыя агульныя рысы з такім тыпам паселішчы як *маёнтак*. Яны падзяляліся на дзяржаўныя, прыватна-ўласніцкія і царкоўныя. Аснова вытворчай дзейнасці маёнтка – сялянская гаспадарка, аснова даходаў – прыбавачная праца феадальна-залежнага насельніцтва. [2, с. 119]. Прыватна-ўласніцкія маёнткамі былі на месцы сучасных населенных пунктаў раёна – Полымя, Ходцы і інш.

Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай ў 1772 годзе Сенненскія землі ўвайшлі ў склад Расійскай імперыі. У XVIII ст. адзначаецца бурны працэс росту гарадскіх паселішчаў. Кацярыны II выдала шмат указаў аб стварэнні новых *гарадоў*. У 1773 годзе Сянно атрымала статус горада Аршанскай правінцыі [1, с. 42]. У канцы XIX – пачатку XX ст. пасля адмены прыгоннага права, ва ўмовах карэнных аграрных пераўтварэнняў, былі распаўсюджаны хутары. Традыцыйны беларускі *хутар* – гэта звычайны асобна стаялы сялянскі двор з гаспадарчымі пабудовамі і садам. Стварэння хутароў вельмі актыўна вялося на Сеннескай зямлі. Было створана больш за дзвесце хутароў (Бакунова, Леванова, Міхайлова, Нямейка, Шумкі).

Кастрычніцкая рэвалюцыя і ўстанаўленне Савецкай улады ў лістападзе 1917 года на Сенненшчыне, аказала свой уплыў на развіццё сеткі населеных пунктаў. У 1919–1930-я гады некаторы час праіснаваў новы тып пасяленне – *камуна*. Яна з'яўлялася тэрытарыяльным аб'яднаннем людзей як у вытворчасці, так і іншых відах дзейнасці. З 1930-х гадоў узнікаюць *пасёлкі*, гэта новы тып нясельскагаспадарчага населенага пункта ў сельскай мясцовасці пры торфапрадпрыемстве, цагляным заводзе, рыбгасе. [2, с. 121]. Забудова пасёлкаў вялася паводле тыповага, праекту. Сёння на тэрыторыі раёна знаходзіцца чатыры пасёлка: Дружба, Пожанькі, Труд, Школа-інтэрнат. У 1930–1960-я гады ў якасці інавацыйнага тыпу паселішча ўзнікае "*савецка-калгаснае сяло*". Створанае шляхам аб'яднання сселеных малодворных вёсак, з далучэннем дамоў ліквідаваных хутароў.

Пасля распаду СССР Сянно стала раённым цэнтрам незалежнай краіны. Сетка населеных пунктаў захавалася з тых часоў. У 2005 годзе ў Беларусі была прынятая "Дзяржаўная праграма адраджэння і развіцця вёскі на 2005–2010 гады". Найважнейшым напрамкам рэалізацыі дадзенай праграмы стала будаўніцтва *аграгарадкоў*. Згодна з праграмай, аграгарадок вызначаўся як добраўпарадкаваны населены пункт, у якім будзе створана вытворчая і сацыяльная інфраструктуры. На тэрыторыі Сенненскага раёна было ўтворана 14 аграгарадкоў: Багданава, Белая Ліпа, Какоўчына, Кругляны, Літусава, Машканы, Нямойта, Полымя, Рулёўшчына, Сінягорская, Студзёнка, Ульянавічы, Ходцы, Янова.

**Заключэнне.** Такім чынам, у складзе раёна: горад Сянно, гарадскі пасёлак Багушэўск, 14 аграгарадкоў, 312 вёсак, 4 пасёлка. Дадзеныя населеныя пункты былі ўтвораны: на месцы фальварка; на месцы панскага маёнтка; на месцы былой калоніі; каля чыгуначнай станцыі; на месцы хутара (некалькіх хутароў); на месцы было МТС; падчас ліквідацыі дробных, так званых "неперспектыўных" вёсак; як зусім новае паселішча.

Літаратура:
1. Памяць: гіст.-дакум. Хроніка Сенненскага р-на / уклад. С.В. Шайко; маст. Э.Э. Жакевіч. – Минск, 2003. – 614 с.
2. Шарухо, И.Н. Исторические типы сельского расселения беларуси: культурно-географические особенности / И.Н. Шарухо // Псковский регионологический журнал. – 2007. – № 5. – С. 115–132.
3. Археалогія Беларусі: энцыклапедыя. У 2 т. Т. 2 / Рэдкал.: Т.У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелЭн, 2011. – 464 с.
4. Археалогія Беларусі: энцыклапедыя. У 2 т. Т. 1 / Рэдкал.: Т.У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелЭн, 2009. – 496 с.
5. Белорусы / РАН, Ин-т этнологии и антропологии ; НАН Беларуси, Ин-т искусствоведения, этнографии и фольклора ; отв. ред.: В.К. Бондарчик, Р. А. Григорьева, М. Ф. Пилипенко. – М. : Наука, 1998. – 503 с.



Репозиторий ВГУ